Обновлено 25.11.2016 16:20
Опубликовано 25.11.2016 16:16

Супрацоўнікі і курсанты Магілёўскага інстытута МУС прынялі ўдзел ў акцыі ўстановы аховы здароўя «Магілёўская абласная станцыя пераліванне крыві». Праводзіцца гэтая бязвыплатная акцыя сярод донараў плазмаферэза у інстытуце штогадова.

Паводле слоў супрацоўнікаў аддзялення нарыхтоўкі крыві і яе кампанентаў МАСПК, тэрмін прыдатнасці матэрыялу – да 35 дзён, а калі, колькі і якіх груп можа спатрэбіцца, прадбачыць немагчыма, таму прыняць актыўны ўдзел у акцыі запрасілі ўсіх неабыякавых.

Таму ўсе, хто па стане здароўя маглі стаць донарамі, прыйшлі ў мабільны пункт здачы крыві, які размясціўся ў нашай установе адукацыі.

– Я стаў донарам упершыню, – пракаментаваў свой удзел у акцыі курсант 2 курса малодшы сержант міліцыі Святаслаў Шкірэеў. – Як камандзір ўзвода, я на сваім прыкладзе вырашыў паказаць, што кожны павінен здаць крыў. Гэта малая частка таго, што мы можам зрабіць, каб дапамагчы хворым.

Любоў ШУМІЛКА
Фота аўтара

news/2016/11_25/blood

Phoca PDF